**УДК 947,6**

***В. П. Гарматны***
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы

# СТАНОВІШЧА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ НА ПАЧАТКУ 1920-Х ГАДОЎ

**Уводзіны.** Да Першай сусветнай вайны (1914—1918) была даволі яскрава вызначана спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі — вытворчасць перш за ўсё збожжавых культур і мясамалочнай прадукцыі [3, с. 11—12]. Выразна акрэсленая сельскагаспадарчая спецыялізацыя і на пачатку 1920-х гадоў заставалася характэрнай рысай эканомікі рэгіёна. Сяляне былі найбольш шматлікаю часткаю заходнебеларускага насельніцтва і адначасова стаялі на самым нізе тагачаснай сацыяльнай лесвіцы. Хуткі рост вясковага насельніцтва, слабае развіццё мясцовай прамысловасці і немагчымасць адтоку празмернай колькасці насельніцтва ў горад з-за адсутнасці там працы выклікалі перанаселенасць заходнебеларускай вёскі і дэфіцыт ворнай зямлі [10, с. 140].

На працягу 1915—1918 гадоў германа-расійскі фронт праходзіў праз Заходнюю Беларусь, лінія акопаў у асноўным пралягала праз Свянцянскі, Ашмянскі, Баранавіцкі і Пінскі паветы. Баявыя дзеянні на азначанай тэрыторыі працягваліся і ў перыяд польска-савецкай вайны (1919—1921), у выніку чаго сельская гаспадарка рэгіёна аказалася суцэльна зруйнаванаю і прыйшла ў поўны заняпад. Зямля была пакрыта акопамі і калючым дротам, з-за чаго сяляне не маглі самастойна яе апрацаваць, і ў выніку, у параўнанні з 1911—1913 гадамі, напалову скараціліся пасяўныя плошчы. На 1920 год неапрацоўваемыя мясцовыя землі складалі прыкладна 2 500 000 га [10, с. 26]. Сельская гаспадарка Заходняй Беларусі мела з-за панесеных страт вельмі нізкія стартавыя магчымасці для далейшага развіцця і патрабавала ад дзяржаўных улад значных капіталаўкладанняў. Паводле падлікаў замежных даследчыкаў, сельская гаспадарка II Рэчы Паспалітай (міжваеннай Польшчы) за 1914—1920 гады ў цэлым панесла страты больш чым на 4 300 000 000 залатых французскіх франкаў (у тым ліку будынкаў на суму 2 000 000 000, драўніны на 1 300 000 000, асабістых запасаў на 800 000 000, вартасць ворных зямель зменшылася на 200 000 000, пагалоўе коней скарацілася на 20%, кароў — на 29%) [11, с. 106].

На 1920 год на ўсёй тэрыторыі адроджанай польскай дзяржавы ў перыяд ваеннага ліхалецця было знішчана 1 546 892 жылых і сельскагаспадарчых будынкаў. Усяго на тэрыторыі Палескага, Навагрудскага, Валынскага і часткова Віленскага ваяводстваў знішчана 456 700 будынкаў (паводле іншых звестак — 558 260), з іх у Навагрудскім ваяводстве зруйнавана 133 125, у Палескім — 129 063, у Віленскім — 28 023. На 1921 год, напрыклад, у Свянцянскім і Ашмянскіх паветах Віленскага ваяводства, якія найбольш пацярпелі ў ходзе баявых дзеянняў Першай сусветнай вайны, было поўнасцю знішчана 159 і 74 вёскі, часткова — 95 і 16 адпаведна; поўнасцю знішчана памешчыцкіх маёнткаў — 8 і 6, часткова — 24 і 20 адпаведна; не мелі хаты 2 147 і 829 вяскоўцаў, не мелі сельскагаспадарчых будынкаў і жылі ў прыстасаваных для пражывання пабудовах 2 497 і 773 сялян адпаведна [14, с. 19—20]. На 1921 год ва ўсходніх ваяводствах II Рэчы Паспалітай налічвалася каля 585 000 гаспадарчых пабудоў (хлявы, клуні, пуні і г. д.) і 571 000 хат, у той час як па ўсёй дзяржаве 3 262 000 і 3 523 000. У адрозненне ад палякаў, мясцовыя сяляне ў першую чаргу аднаўлялі свае гаспадарчыя будынкі, а не хаты, усе свае сілы аддаючы менавіта на адраджэнне асабістай гаспадаркі і мяркуючы такім чынам хутчэй палепшыць асабістае матэрыяльнае становішча.

Паводле рэляцыі (справаздачы) сеймавых паслоў Народна-нацыянальнага саюза ў лістападзе 1920 года, насельніцтва Заходняй Беларусі знаходзілася ў вельмі складаным матэрыяльным становішчы і апынулася на мяжы выжывання: «Становішча гэтых трохі больш дваццаці ўсходніх паветаў, на якіх толькі скончыліся баявыя дзеянні, ёсць проста жахлівае. Тут мелюць чабор, страву гатуюць без солі; хлеб з бураковай батвы (так у дакуменце) і нават без дамешку мукі… становіцца ў наваколлі адзінаю крыніцаю харчавання (гэтых бедных) людзей, якія паміраюць тысячамі». У выніку баявых дзеянняў сельская гаспадарка Заходняй Беларусі была амаль суцэльна зруйнавана, заходнія ж ваяводствы краіны панеслі страты ў меншай ступені і знаходзіліся ў значна лепшых умовах.

Каля 1 500 000 беларусаў у перыяд Першай сусветнай вайны эвакуіраваліся ў цэнтральную Расію. На 1922 год на радзіму ў Заходнюю Беларусь вярнуліся 373 343 бежанцы: з іх у Віленскае ваяводства — 29 662, Навагрудскае — 118 697, Палескае — 157 151, беларускія паветы Беластоцкага — 67 833, што яшчэ больш абвастрыла становішча на вёсцы.

**Асноўная частка.** Пасля заключэння 18 сакавіка 1921 года Рыжскага мірнага дагавора Заходняя Беларусь трапіла ў склад міжваеннай Польшчы. На той час каля 65,6% (каля 2/3) працаздольнага насельніцтва Польшчы было занята ў сферы сельскай гаспадаркі. У Заходняй Беларусі ў азначаны перыяд каля 80—90% яе жыхароў складалі сяляне: у Віленскім ваяводстве — 88,6%, у Навагрудскім — 83,7%, у Палескім — 82,0%. Дамінуючае становішча ў Заходняй Беларусі на пачатку 1920-х гадоў займала прыватнае землеўладанне, якое і вызначала структуру аграрных адносін: 88,4% ворных зямель належалі прыватным асобам, 10,8% — дзяржаве, 0,3% — царкве і касцёлу, 0,5% — іншым [3, с. 20]. Паводле дадзеных сельскагаспадарчага перапісу, на 30 верасня 1921 года ў Беластоцкім ваяводстве налічвалася 15,3% дробных сялянскіх гаспадарак з надзелам да 2 га, 25,8% — ад 2 да 5 га, 53,2% — ад 5 да 20 га; у Навагрудскім — 13,2; 38,3; 43,9%; Віленскім — 12,3; 7,6; 48,0%; па міжваеннай Польшчы — 37,7; 33,8 і 26,0% адпаведна.

Сяляне Заходняй Беларусі былі ў сваёй большасці малазямельнымі і беззямельнымі. Дробныя гаспадаркі мелі невялікія надзелы ўласнай альбо арандаванай зямлі і вымушаны былі арандаваць дадатковую зямлю ў памешчыкаў і заможных сялян, наймацца да іх на працу. У параўнанні з польскімі сялянамі, у руках сялян Заходняй Беларусі восенню 1921 года было сканцэнтравана значна менш зямель, што абумовіла іх вельмі цяжкае маёмаснае становішча. Сітуацыю ўскладняў высокі кошт зямлі.

Заходнебеларускія сяляне (асабліва на Палессі) значна пакутавалі ад недахопу свойскай жывёлы, што адмоўна ўплывала на колькасць арганічных угнаенняў, своечасовую і якасную апрацоўку зямлі і выкананне іншых сельскагаспадарчых работ. На працягу міжваеннага перыяду каля 29% сялянскіх гаспадарак Заходняй Беларусі не мелі коней, 58,8% мелі аднаго каня; 15,75% гаспадарак не мелі кароў, а 51,1% валодалі толькі адной каровай. Па становішчы на 1921 год на 100 чалавек насельніцтва ў Віленскім і Навагрудскім ваяводствах налічвалася 16,0 коней, 30,1 галоў буйной рагатай жывёлы, 28,5 свіней, 23,6 авечак; Палескім — 12,4; 42,0; 23,0; 16,0, у той час як перад Першаю сусветнаю вайною (на 1912 год) у Літве і Беларусі іх было 15,5; 32,5; 22,5 і 17,2 адпаведна [6, с. 35].

Зямля ў большасці асабістых сялянскіх гаспадарак Заходняй Беларусі апрацоўвалася пераважна прымітыўнымі сельскагаспадарчымі прыладамі, асноўнаю з якіх стаў драўляны плуг з металічным лемехам. У некаторых мясцовасцях, і асабліва на Палессі, шырока выкарыстоўвалася прыстасаваная для вупражкі валоў саха [9, с. 100]. У цэлым узровень механізацыі сельскай гаспадаркі быў надзвычай нізкім, ва ўсіх памешчыцкіх маёнтках Заходняй Беларусі на 1921 год налічвалася 85 трактараў, але яны большую частку часу прастойвалі па прычыне дарагавізны паліва і таннасці працы мясцовых сялян. На адзін трактар прыходзілася каля 8 000 га ворнай зямлі, што было відавочна зашмат [8, с. 192]. Некаторыя памешчыкі мелі конныя механічныя прывады.

У тагачасным паляводстве пераважала трохпольная сістэма севазвароту, і толькі ў найбольш буйных памешчыцкіх латыфундыях выкарыстоўваліся шматпольныя севазвароты. Асноўным відам угнаенняў на працягу многіх гадоў заставаўся гной, мінеральныя тукі ўносілі толькі памешчыкі, асаднікі і некаторыя заможныя сяляне. Сяўба збожжавых у сялянскіх гаспадарках праходзіла пераважна ўручную. Сабраны ўраджай збожжавых звозіўся ў гумны, а затым абмалочваўся. Пры ўборцы і абмалоце ўраджаю вяскоўцамі выкарыстоўваліся косы, сярпы, цапы і драўляныя вілы [3, с. 49—50].

Сельская гаспадарка Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гадах мела напалову натуральны характар, яе даходнасць заставалася пераважна даволі нізкаю. Шырокае распаўсюджанне ў тагачаснай заходнебеларускай вёсцы, асабліва на Палессі, атрымалі жорны, ткацкія станкі, дамашняе ганчарства, капцілкі і крэсала. Рацыён мясцовых сялян быў абмежаваны хлебам і бульбаю, з харчовых тавараў сяляне куплялі соль і ў рэдкіх выпадках цукар. Больш за тры чвэрці неабходнага для жыцця (ежа, абутак, вопратка, інвентар) выраблялася ў асабістай гаспадарцы селяніна. Акрамя таго, на пачатку 1920-х гадоў назіралася выразная спецыялізацыя асобных заходнебеларускіх рэгіёнаў па вытворчасці некаторых відаў прадукцыі. Так, напрыклад, вёска Гарадная Столінскага павета Палескага ваяводства далёка славілася сваімі ганчарнымі вырабамі, мястэчка Давыд-Гарадок Столінскага павета — вырабам скуранога абутку, вёска Моталь Драгічынскага павета Палескага ваяводства — вырабам кажушкоў. Вяскоўцы Лунінецкага, Пінскага, Столінскага паветаў былі галоўнымі пастаўшчыкамі рыбы ў Варшаву, Вільню і іншыя гарады, насельніцтва Давыд-Гарадка і ваколіц займалася вандроўным продажам слодычаў [13, с. 105, с. 109].

У многіх выпадках аплату за сваю працу сяляне атрымлівалі прадуктамі. Напрыклад, у пачатку 1920-х гадоў у Дзісненскім павеце Віленскага ваяводства за месяц працы ў сельскай гаспадарцы заможнага селяніна працаўнік зарабляў каля 7 пудоў жыта (112 кг, прыкладна 24,5 злотых у грашовым эквіваленце). Калі ў заходнебеларускага селяніна з'яўляліся грошы, то ён іх укладваў галоўным чынам у набыццё свойскай жывёлы ці дадатковага надзелу ворнай зямлі. Грашовыя сродкі ў асноўным затрачваліся на выплату падаткаў, куплю прамысловых тавараў і аплата царкоўных абрадаў. У сувязі са складаным эканамічным становішчам тады тавар у крамах і на рынках сяляне часта не куплялі, а выменьвалі на прадукты [4, с. 95]. Эканамічную сітуацыю абцяжарвалі высокія падаткі і кошты на прамысловыя тавары, захаванне значнай колькасці перажыткаў з часоў прыгонніцтва: наяўнасць буйнога памешчыцкага землеўладання, вялікіх латыфундый, сервітутаў, дробная арэнда памешчыцкай і дзяржаўнай зямлі за адпрацоўкі ці частку ўраджаю, аплата натураю, шарваркі і г. д. У сувязі з гэтым

у 1919—1921 гадах у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне назіраўся найніжэйшы ўзровень ураджайнасці па ІІ Рэчы Паспалітай. Такое становішча абумоўлена слабымі агратэхнічнымі ведамі мясцовага насельніцтва і недахопам сельскагаспадарчага інвентара, машын, свойскай жывёлы і ўгнаенняў [12, с. 15—16].

Польская дзяржава аказвала фінансавую і іншую дапамогу бяднейшым сялянскім гаспадаркам і перш за ўсё будматэрыяламі. Так, паводле распараджэння Генеральнага камісара ўсходніх зямель Ежы Асмалоўскага ад 18 ліпеня 1919 года, на дапамогу сялянам, якія мелі менш 15 дзесяцін, з дзяржаўных лясоў выдзялялася па 50 бярвенняў, але ў цэлым не больш 20 $м^3$. Выдача будматэрыялаў праводзілася на падставе справаздач мясцовых войтаў аб ваенных знішчэннях і колькасці ў гаспадарцы ворнай зямлі, засведчаных праз павятовага старасту. Пры адсутнасці дзяржаўнага лесу ў адлегласці 20 вёрст (21,32 км), выдача сялянам будматэрыялаў па рашэнню мясцовага акруговага аддзела Міністэрства дзяржаўных маёмасцей ажыццяўлялася з прыватных лясоў, па магчымасці з нарыхтаванага і не вывезенага немцамі альбо высечанага сялянамі самавольна [2, арк. 76].

Прадстаўнікі польскай адміністрацыі адзначалі, што пры аднаўленні сялянскіх гаспадарак і кампенсацыі сялянам, якія матэрыяльна пацярпелі пры вызначэнні польска-савецкай дзяржаўнай мяжы, неабходна асабліва надаваць увагу маёмасці сялян, што засталіся на жыхарства ў Савецкай Расіі, землям, якія належалі царкве, касцёлу альбо манастырам, знаходзіліся побач ці недалёка ад вёскі. Пры немагчымасці кампенсацыі сялянам страт з пералічаных крыніц неабходна выкарыстоўваць іншыя катэгорыі маёмасці. Разам з тым падкрэслівалася, што «(польскі) урад не абавязаны кампенсаваць сялянам, якія страцілі пры правядзенні (дзяржаўнай) мяжы часткі сваіх зямель, але робіць гэта з маральных поглядаў, а таксама з-за стану існуючых мясцовых аграрных адносін, дзеля таго, каб давесці іх да нармальнага становішча» [1].

Польскія ўлады бачылі цяжкае матэрыяльнае становішча насельніцтва Заходняй Беларусі і па меры магчымасці аказвалі дапамогу збожжам, бульбаю і іншым на распачынанне гаспадаркі. Але дапамога была вельмі абмежаванай і яўна недастатковай у цяжкіх пасляваенных умовах. Так, у 1921 годзе сялянам гміны Жабінка Кобрынскага павета Палескага ваяводства ўладамі перададзена 3 436 пудоў (550 цэнт-нераў) бульбы і аказана фінансавая дапамога ў 564 009 тагачасных польскіх марак, гміны Сяхновічы — на восеньскую сяўбу 4 324 пуды (692 цэнтнеры) жыта, праводзіўся збор ахвяраванняў на карысць сем’яў афіцэраў і салдат, якія загінулі ў мінулых войнах, дзяцей-сірот і г. д. [5, с. 156].

**Заключэнне.** У перыяд Першай сусветнай і польска-савецкай войн баявыя дзеянні доўгі час праходзілі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, у выніку чаго яна прыйшла ў поўны заняпад. На пачатку 1920-х гадоў Заходняя Беларусь была адарвана ад сістэмы агульнарасійскіх эканамічных і вытворчых адносін, усерасійскага рынку і рэгіянальнага падзелу вытворчасці, што не магло не адбіцца адмоўна на развіцці мясцовай эканомікі і галоўным чынам сельскай гаспадаркі як яе асновы. Заходнебеларуская вёска была перанаселена, з-за чаго ворная зямля была ў вялікім дэфіцыце і адпаведна каштавала вельмі дорага.

На пачатак 1920-х гадоў у заходнебеларускай вёсцы былі даволі слаба развіты капіталістычныя адносіны, захавалася значная колькасць перажыткаў з часоў паншчыны, у сельскагаспадарчай сферы шырока выкарыстоўвалася ручная праца і натуральная аплата, а ўзровень тэхнічнай забяспечанасці і ўраджайнасць былі найніжэйшымі з усёй міжваеннай Польшчы. У Заходняй Беларусі патрабавалася правядзенне шэрагу істотных аграрных пераўтварэнняў, накіраваных на аднаўленне і далейшае развіццё сельскай гаспадаркі.

Польская дзяржава на пачатку 1920-х гадоў ставіла сваёю галоўнаю мэтаю замацавацца на новадалучаных тэрыторыях, у сувязі з гэтым імкнулася навесці парадак у маёмасных адносінах у аграрнай сферы Заходняй Беларусі: вызначыць дакладныя межы надзелаў і прозвішчы іх гаспадароў, з мэтаю чаго быў праведзены сельскагаспадарчы перапіс 1921 года.

### Спіс цытаваных крыніц


1. Указание Министерства земельных реформ о компенсации земли семьям, пострадавшим при проведении советско-польской границы // Дзярж. архіў Гродз. вобл. (ДАГВ). — Фонд 550. — Воп. 1. — Спр. 17.
2. Циркуляры Министерства общественных работ и Генеральной строительной дирекции об оказании материальной помощи пострадавшим во время военных действий и составлении бюджета на помощь пострадавшим // Дзярж. архіў Гродз. вобл. (ДАГВ). — Фонд 687. — Воп. 2. — Спр. 1.
3. *Кухарев, Б. Е.* Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919—1939 гг.) / Б. Е. Кухарев ; под ред. И. Н. Шемякина. — Минск : Высш. шк., 1975. — 110 с.
4. *Мисиюк, В. С.* Экономические условия модернизации крестьянского хозяйства Западной Белорусии (1921—1939 гг.) / В. С. Мисиюк // Славянские страны в условиях системной трансформации и европейской интеграции : сб. науч. тр. / Брест. гос. техн. ун-т ; науч. ред. Я. С. Яскевич. — Брест : [б. и.], 2005. — Вып. 2. — С. 95—99.
5. Памяць: Кобрынскі раён : [гіст.-дак. хроніка] / рэд.-уклад. Л. Р. Казлоў. — Мінск : БелТА, 2002. — 622 с.
6. *Смоліч, А.* Сялянства Заходняй Беларусі (яго сучаснае палажэнне) / А. Смоліч // Заходняя Беларусь : зб. — Менск : [б. в.], 1925. — С. 31—42.
7. *Сорокин, А. А.* Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920—1939 гг.) / А. А. Сорокин. — Минск : Наука и техника, 1968. — 201 с.
8. *Тахіян, Т. М.* Умовы развіцця сельскай гаспадаркі, прамысловасці і гандлю на землях Івацэвіччыны ў 1921—1939 гг. / Т. М. Тахіян // Осень 1939 года: коренной перелом в судьбе белорусского народа : материалы Респ. науч.-практ. конф., Брест, 24—25 сент. 2009 г. / Брест. гос. ун-т ; ред.: Н. Н. Ковалева, Л. Ю. Малыхина. — Брест : [б. и.], 2009. — С. 192—197.

9. *Томчонек, С.* Полесское воеводство 1918—1939 гг. (избранные проблемы) / С. Томчонек // Славянскія краіны ў эпоху глабалізацыі : зб. навук. пр. / Брэсц. дзярж. тэхн. ун-т ; Я. С. Яскевіч (гал. рэд.) [і інш.]. — Брэст : [б. в.], 2004. — Вып. 1. — С. 99—103.
10. Historia chłopów polskich. : w 3 t. / pod red. S. Inglota. — Warszawa : Lud. Spółdz.Wydaw., 1970—1980. — T. 3 : Okres II Rzeczypospolitej i okupacji hitlerowskiej. — 1980. — 715 s.
11. Problemy gospodarcze Drugiej Rzeczypospolitej / red. K. Kozlowski. — Warszawa : Państ. Wydaw. Ekon., 1989. — 439 s.
12. Przestrzenne, ekonomiczne i społeczne problemy scalania i wymiany gruntów : kompendium wiedzy — poradnik dla liderów wspólnot samorządowych / pod red. M.W. Wierzchowskiego. — Kraków : Inst. Rozwoju Miast, 2007. — 115 s.
13. *Tomaszewski, J.* Z dziejów Polesia, 1921—1939: zarys stosunków społeczno-ekonomicznych / J. Tomaszewski. — Warszawa : Państ. Wydaw. Nauk., 1963. — 208 s.
14. *Tomczonek, Z.* Ruch ludowy na kresach północno-wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej / Z. Tomczonek. — Białystok : Wydaw. Politech. Białostockiej, 1996. — 247 s.

Матэрыял паступіў у рэдакцыю 24.02.2014 г.

**УДК 128**

***Г. Е. Головницкая***
Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи

## ИНФОРМАЦИОННОЕ ОБЩЕСТВО: СИМУЛЯЦИЯ РЕАЛЬНОСТИ И ПРОБЛЕМАТИЗАЦИЯ ИСТИНЫ

**Введение.** Современное человечество живёт в условиях формирования открытого информационного общества, в котором информация становится важнейшим фактором развития всех сфер жизнедеятельности. Существенной характеристикой информационного общества является лавинообразный рост количества электронных информационных ресурсов, свободное распространение информации, неограниченный доступ к ней. Однако, согласно мысли известного французского философа современности Ж. Бодрийяра, парадоксальным следствием развития массовых коммуникаций и «общества информации» явилась «агония реальности». Под этим выражением, ставшим в конце XX века крылатым, Бодрийяр имел в виду то, что сама идея реальности как чего-то объективного и независимого от человека и отличного от выдумки или иллюзии пропадает в сознании. Причиной этой трансформации сознания Ж. Бодрийяр считал, прежде всего, средства массовой информации. Казалось бы, их стремительное развитие должно было означать небывалое приближение к реальности. Каждый человек может мгновенно связаться с любой точкой планеты, узнать, что происходит в мире и что хранится в культурной памяти человечества. Одно нажатие клавиши — и человек приближает к себе реальность, добиваясь нового успеха в освоении истины. Однако случилось непредвиденное. Общество тотальной информации вовсе не есть общество истины. Оказалось, что самая могущественная технология добывания истины начисто лишена способности отличать истину от фикции.

**Основная часть.** Система массовых коммуникаций провоцирует работающих в ней людей «фабриковать реальность» по своему усмотрению. Без всякой лжи — с помощью некоторой односторонности в освещении фактов — можно создавать разные, равно обоснованные фактами картины реальности. Если же потребуется подменить реальность, то и для этого есть великолепные средства. Реальность и истина оказались множественными. Единственной реальности как бы и нет вообще. Современный человек живёт в контексте гиперреальности — множественной, расслаивающейся реальности, рождающейся сквозь различные информационные тексты и голоса, перебивающие и усиливающие друг друга, искажающиеся в невероятных условиях. По Бодрийяру, определяющую роль в человеческом сознании начинают играть симулятивные модели реальности: знаковые модели на самом деле рождают реальность, которую они якобы просто отображают. Фактически происходящие события оказываются лишь поводом для своеобразной экранной репродукции, которая определяет, что произошло «на самом деле». Тем самым образное бытие, являясь результатом симуляции бытия, становится первичным по отношению к бытию. В условиях информационного общества все события происходят в технологическом режиме. «И не является ли тогда эта безграничная инсталляция, этот художественный перформанс, в сущности, театром, где место актёров заняли операторы?» [1, с. 31]. Этим вопросом французский философ обозначает проблему: электронные медиа и информационные технологии ставят под вопрос традиционное разделение воображаемого и действительного. Реальное, которое производится в любом виде и объёме, становится операциональным. «Виртуальное, каким мы его мыслим сегодня, — это сфера, где нет ни субъекта мысли, ни субъекта действия, где <…> уже нет ценности — здесь царствует простая информативность, просчитываемость, исчислимость, отменяющая любые эффекты реального» [1, с. 31]. В условиях, когда создаётся виртуальный двойник Вселенной, образ действительности лишь в ничтожно малой степени основывается на собственном опыте индивида, и в столь же малой степени может быть установлена его достоверность. Однако очевидно, что этот виртуальный мир влечёт к себе человека. Наряду с производством симуляции Вселенной